Cana asobnaha numaru 20 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 10 (555). Wilnia, Niadziela 25 Lutaha 1934 h. Hod X (XVIII).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adres Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 ran. da 4 hadz. wieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

„Biel. KRYNICA" kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

Палітыка апошніх дзён і Беларусы.

Калі закранаем гэткую справу, дык пэўне-ж маем на ўвеце палітыку міжнародную, а сьцісьлей кажучы — маем на ўвеце тую палітыку, якая бліжэйшае ці далейшае мае значэньне для беларусаў. І як гэта ня дзіўна, але, калі хочам гаварыць аб тэй міжнароднай палітыцы, якая ў сваіх наступствах адбіваецца і на лёсе беларускага народу, мусім пачаць з Далёкага Усходу, а фактычна з Японіі

Японія так разраслася і разьвілася, што цесна ей стала жыць на яе радзімых астравох. Самазахаваўчае прыроднае імкненьне дыхтуе японскаму 70-ці мільённаму народу пасовацца на Захад, у кірунку непрайдзімых прастораў Сібіры.

Японія так і робіць. Сьпярша яна дабіцца большай тэрыторыі сабе імкнулася дарогай спакойнай, дыплёматычнай, супрацоўнічаючы з Эўропай у Лізе Народаў. Калі-ж гэткая дарога не вяла да мэты, Японія выступіла з Лігі Народаў, пакінула надзею на дыплёмацыю і выразна зор'ентавалася на сілу збройную У выніку гэткай японскай палітыкі ўся, належачая раней да Кітая, вялікая Манджурыя (939,300 кв. км, 12,740.000 насельніцтва) пад відам самастойнай дзяржавы апынулася ў поўным распараджэньні японцаў.

Як на пачатак дык і досыць. А далейшыя пляны японцаў гэткія: адапхнуць цалком СССР з Далёкага Усходу і ад портаў Вялікага Акеяну, — забіраючы пабярэжжа яго з портам Владівастокам, — захваціць пад сваю «апеку» — нібы незалежную, а фактычна залежную ад СССР і часткова ад Кітая, — вялізарную (3.360,000 кв. км.) Манголію, грозьбай і прозьбай дагаварыцца з Кітаем (4.044,800 кв. км , 302.110,000 галоў насельніцтва) і ў імя ідэалу: Азія для Азіятаў, супольнымі сіламі даць рашучы адпор Эўропе і Амэрыцы, якія ўсьцяж такім ці іншым чынам карыстаюць з багацьцяў Далёкага Усходу, а ў першую чаргу — расправіцца з СССР, адсоўваючы яе аж за Байкал, а як добра пойдзе — дык аж за Урал.

Пэўне-ж, гэта покульшто толькі звычайныя гутаркі, далёкія пляны. Але справы гэтыя ня ёсьць глупствам Калі-б азіяцкія народы дайшлі да сьведамасьці адзінства расы, а прадусім адзінства інтарэсаў, — а рух гэткі там пад зручным кіраўніцтвам Японіі разьвіваецца сапраўды, — дык-бы тады жоўтыя паказалі-б белым, што яны ўмеюць.

У кожным выпадку — не тады сабак карміць, як на паляваньне ісьці. Гэтага правіла трымаюцца і Саветы, загрожаныя жоўтымі ў першую чаргу. Яны баяцца Японіі і дзеля гэтага на зламаны лоб зброяцца, а што да нерасейскіх народаў, у іх ліку і да беларусаў, вядуць палітыку, якую і цар вёў: палітыку душэньня іх народнага і соцыяльнага жыцьця, абеднаваньня іх сілай з Расеяй, тварэньня вялікай і магутнай, «единой і неделимой» Расеі. Усякія соцыяльныя ідэалы, справа дабрабыту сялян і работнікаў яшчэ больш там пагоршыліся, бо чырвоная дзяржава натужвае ўсе свае сілы, каб не дапусьціць да развалу СССР праз аддзяленьне ад яе цэлага раду не расейскіх народаў, якія сяньня імкнуцца да сваей самабытнасьці, як беларусы, украінцы, грузіны і інш.

Цікава, што гэткую палітыку маскоўскіх чырвоных імпэрыялістаў паддзержваюць і даўнейшыя маскоўскія імпэрыялісты чорныя. Так напр. галава «паступовай» заборчай прадваеннай маскоўскай палітыкі П. Мілюкоў, прабываючы на эміграцыі ў Парыжы, апошнім часам вядзе заўзятую агітацыю сярод расейскай эміграцыі падтрымаць бальшавіцкую сучасную заграгічную палітыку, бо інакш наступіць падзел Расеі.

Страх СССР японскай палітыкі давёў урэшце да таго, што бальшавікі пакінулі сны аб усесьветнай рэвалюцыі і пападпісвалі з многімі буржуазнымі дзяржавамі мірныя дагаворы. Гэткі дагавор між іншымі падпісаны між СССР і Польшчай. Апошнія ж адведзіны польскага міністра заграгічных спраў бальшавіцкіх валадароў у Маскве і чулыя прамовы на банкетах ня толькі за ўзаемную дружбу між Польшчай і СССР, але і за памыснасьць «малжонкаў» міністра Бэка і камісара Літвінава, вымоўна гавораць, што дружба гэта сяньня дужа пажадана як для аднэй, так і для другой стораны.

Маскоўскую старану гоніць да дружбы з Польшчай прадусім тая-ж японская палітыка, а польскую да дружбы з Масквой падганяе — сучасная палітыка нямецкая. Гэтая польска-расейская дружба ў выніках сваіх так-жа ад'ёмна адбіваецца на лёсах беларускага народу. Палітыка гэта што да нас разьвязвае рукі, як Маскве, так і Варшаве. Палітыка гэта, як белым, так і чырвоным паном нашым, дыхтуе ўважаць, што беларускага народу, які мае самастойніцкія імкненьні, сусім няма і быць не павінна.

І сапраўды, вынікі польска-маскоўскай дружнай палітыкі мы беларусы ад некаторага часу адчуваем выразна.

Далёкія мы аднак ад таго, каб справу гэту разважаць для беларускага народу занадта трагічна. Благія варункі разьвіцьця для якога народу часам больш яму выходзяць на дабро, як добрыя. Прыпамінаецца нам гэткае гістарычнае здарэньне. Нядаўна памёршы прэзыдэнт Каталёніі — палкоўнік Масія — рабіў сабе вайсковую кар'еру ў гішпанскім войску і сусім ня думаў аб лёсе свайго роднага каталёнскага народу. І толькі скрайны ўціск гэтага народу, дзікой праявай якога — між іншым быў пагром гішпанскімі афіцэрамі каталёнскіх рэдакцыяў, апамятаваў Масія і паставіў яго на ногі. Масія стаў на чале каталёнскага вызвольнага руху і давёў сваю Каталёнію бадай да поўнай незалежнасьці.

Вось жа вялікая міжнародная палітыка, якая сваім цяжарам гняце беларускі народ, у апошнім выніку павінна гэтаму народу выйсьці толькі на дабро. Аб гэтым нас вуча і гісторыя і псыхолёгія, як адзінак, так і народаў.

З дзейнасьці Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры.

Жодзішкі Вялейскага пав. Дня 4.II.34 г. адбылося агульна-сяброўскае сабраньне Жодзішнага Гуртка Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры з такім парадкам дня:

1. Выбары старшыні сабраньня.
2. Адчытаньне пратаколу апошняга сабраньня.
3. Справаздача з дзейнасьці гуртка за 1933 год.
4. Перавыбары Ураду Гуртка.
5. Плян працы на будучыню.
6. Вольныя прапазыцыі.

1. Сабраньне адбылося ў прысутнасьці 16 сяброў, якое адчыніў старшыня Ураду Гуртка гр. Янка Чартовіч, які па адчытаньні парадку дня запрапанаваў выбраць Старшыню сабраньня, падаючы як кандыдата гр. Андрэя Цікоту, на што сабраньне аднагалосна згадзілася. Старшыня сабраньня, абняўшы кіраўніцтва, паклікаў на сэкрэтара гр. Эдварда Цікоту і прыступіў да далейшых пунктаў парадку дня.

2. Пратакол агульна-сяброўскага сабраньня з 1933 г. адчытаў сэкрэтар Ураду Гуртка, гр. Г. Савіцкі, які сабраньне прыняло да ведама.

3. Справаздачу з дзейнасьці Гуртка за мінулы год здаў ад імэні Ураду Гуртка сэкрэтар Ураду, гр. Г. Савіцкі, з чаго сабраньне даведалася, што Урад адбыў у працы гэтага году 6 паседжаньняў Ураду, зладзіў 5 прадстаўленьня і адну лекцыю на тэму аб коопэрацыі. Каса Гуртка мае гатоўкі 55 зл. 40 гр., сяброў налічваецца 47 асоб. Пры тэтым Урад адзначыў, што сябры, за выняткам некалькіх, не ўнясьлі яшчэ сяброўскіх складак, з чаго паўстаў дэфіцыт за мінулы год, і падаў да ведама, што з прычыны цяжкога матэр'яльнага палажэньня сяброў касуе залеглую складку з мінулага году, заклікаючы адначасна, каб складку за бягучы год унясьлі абавязкава.

4. У Урад Гуртка на бягучы год выбраны наступныя сябры:
1) Старшыня — Янка Чартовіч,
2) Скарбнік — Антон Бабок,
3) Сэкрэтар — Міхась Рыдзель.
У заступнікі 1) Гіпаліт Савіцкі, 2) Міхась Галяк.

5. Укладаючы плян працы на будучыню, пастаноўлена перадусім: 1) Дамагацца адчыненьня роднай школы, 2) Упарадкаваць бібліятэку, а іменна: спагнаць выдадзеныя да чытаньня кніжкі і прывясьці іх у належны парадак і дакупіць у меру магчымасьці новых; кіраўніком бібліатэкі вызначыць Міхася Мароза, 3) Ладзіць як найбольш прадстаўленьняў і лекцыяў

6. З прычыны цяжкога матэр'яльнага палажэньня на вёсцы пастаноўлена абнізіць сяброўскую складку на 50 грашэй.

На гэтым сабраньне закончана.

Мур. Ашмянка, Ашмянскага павету. З справаздачы, якую прыслаў Гурток з Мур. Ашмянкі, відаць, што Гурток змагаецца з вельмі цяжкімі абставінамі. Адбыліся два паседжаньні Ураду Гуртка у справе лекцыяў. Пасылалі ў староства паведамленьні на лекцыі, але на першую лекцыю не атрымалі на час паведамленьня ад староства, дык баяліся ладзіць лекцыі, каб ня прышла часам забарона (калі забароны няма, значыць лекцыю ладзіць можна — Рэд.), а за другім разам прышло паведамленьне і лекцыя адбылася на тэму: „Францішак Багушэвіч і яго творчасьць," лектар — гр. Я. Ярмалковіч з в. Юшкі.

Слова друкаванае пашыраецца, таксама чытаньне газэт і кніжак, але толькі пасярод старэйшых, бо моладзь гэтым ня цікавіцца, а толькі любіць танцы і гульні. На нашы спэктаклі староства не давала дазволу, аб чым Гурток няраз пісаў у Цэнтралю і пасылаў у рэдакцыі газэт. Нясьведамую моладзь ксяндзы і вучыцялі цягнуць да сябе, што нядзелі робячы дармовыя спэктаклі і вечарыны. У справаздаўчым годзе Гурток пацярпеў вялікую страту: памёр дзейны сябра В. Чаплінскі, а другі дзейны сябра, Пашкевіч, выехаў на навуку ў земляробскую школу. Пры нястачы адпаведных сіл, Гурток ня мог разьвіць жывейшай акцыі, але кажа Гурток — „робім што можам." Уканцы Гурток просіць прыслаць кагоколечы з Цэнтру, каб памагчы ў працы.

ГРАМАДЗЯНЕ! Усе на ніву культуры! Гдзе няма, — арганізуйце гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры а гдзе ўжо заложаныя узмоцніце ў іх працу!

Niedakončanaje światkawańnie dnia litoŭskaj niezaležnaści.

Światkawańnie pačatku dnia 16.II, u jaki minuła 16 hadoŭ litoŭskaj niezaležnaści, prajšło ŭračysta i narmalna. Zdawałasia, što i kaniec henaha dnia projdzie nia horš ad pačatku i pawodle zahadzia apracawanaj prahramy. Časopiś naša, jakaja wychodziła ŭ świet wiečaram taho samaha dnia, achwotna skarystała z paśpiešnych wiestak ab akademii našaha infarmatara, jak paśla akazałasia, apiortych tolki na prahramie.

Wiečaram taho ž 16.II na akademiju ŭ zali Lit. Himn. im. Witaŭta Wialikaha ŭ Wilni sabrałasia mnoha narodu. Aprača litoŭcaŭ niamała było biełarusaŭ, studentaŭ ukraincaŭ i nawat žmienia palakoŭ.

Na akademii Staršynia Lit. Tymč. K-tu hr. K. Stašys skazaŭ nastupnuju pramowu: „Sabralisia my tut hramadna światkawać najwialikšaje litoŭskaje świata. Siańnia świata swabody litoŭskaha narodu.

Jašče nia tak daŭno, bo 16 hadoŭ tamu, nad Litwoj panawała doŭhawiečnaja noč. Inšyja narody nia ličylisia z Litwoj, a niekatoryja z ich byli nawat zabyŭšysia, što jość na świecie jašče adna ich siastryca — litoŭski narod. Ale woś 16 hadoŭ tamu, u hetaj samaj staroj stalicy Giedymina, było skazana mahutnaje słowa swabody narodu. Doŭhawiečnaja noč ščezła i pakazałasia Litwie sońiejka swabody.

Litwa paŭstała, bo jana i padčas panawańnia nad jej ciemry žadańnia swabody nie wyrakałasia. Litoŭskija matki pry kałaŭrotach z pakaleńnia ŭ pakaleńnie pieradawali darahuju pamiać prodkaŭ, ich mowu i pieśni, ich wialikuju luboŭ baćkaŭščyny i prykłady samaachwiarnaści...

Swaboda Litwy radziłasia, rasła i daśpiawała ŭ sarcoch najlepšych dziaciej jaje, a paśla była kuplena ich trudom, ciarpieńniami i śmierciaj. Swaboda Litwy — heta płod doŭhich hadoŭ baraćby narodu. Ślozy i kroŭ jaho ščodra byli praliwany, až pokul siła ŭcisku była złamana i worahi z rodnaha Kraju byli wyhnany...

Praz hetyja 16 hadoŭ niezaležnaha žyćcia litoŭski narod bolš dasiahnuŭ i wyšej padniaŭsia, čymsia za doŭhija wiaki niawoli. U hetym-ža i ŭsia sutnaść niezaležnaści, dziela-ž hetaha tak jaje i ceniać narody i tak jaje pažadajuć.

Jašče šmat litoŭcaŭ astałosia za ścianoj budynku swabody, mnohim los horka jašče uśmiechajecca, usie my adnak supolnym sercam ciešymsia z narodnych zdabytkaŭ i ŭ ich znachodzim aporu dla našaha ducha ŭ baraćbie za našy prawy i za lepšy byt..

Nažal, sioleta radaść usiaho litoŭskaha narodu dla litoŭcaŭ Wilenščyny akazałasia narušanaj sumam i žalem. Na pradadni narodnaha świata siarod miajscowaha litoŭskaha hramadzianstwa zapanawała takoje abureńnie, jakoje Wilenskamu Tymč. Lit. K-tu nie daje mahčymaści rabić jakijakolečy ŭračystaści, choć takija i byli pradbačany. Dziela hetaha dalejšaje światkawańnie nie adbudziecca. Pawažanaje heta sabrańnie začyniaju i prašu ŭsich spakojna razyścisia damoŭ."

Publika, prapiajaŭšy lit. narodny hymn, nieachwotna pačała raschodzicca.

Uračystaja akademija nie adbyłasia na znak pratestu prociŭ mnohich rewizijaŭ i aryštaŭ, jakich apošnim časam dakanała palicyja siarod litoŭcaŭ ŭ Wilni i na prawincyi.

M. K.

Z biełaruskaj katalickaj niwy.

a. A. Cikota ŭ Wilni. 24—25.I. Jenerał a.a. Maryjanaŭ a. A. Cikota pa darozie z Rymu ŭ Druju haściŭ u Wilni. Z Drui pajechaŭ na wizytacyju maryjanskich klaštaraŭ: u Łatwiju i Litwu, u Anhliju i ŭ Ameryku, dzie zabawicca niekalki miesiacaŭ.

U balšawickaj niawoli na Sałoŭkach znachodziacca dwa ksiandzy biełarusy: P. Chomič i M. Piatkiewič. P. Chomič ad ździekaŭ dastaŭ pamiašańnia rozumu.

Audyjencyja ŭ Papieža. Watykanskaja časopiś „Osservatore Romano" danosić, što Jenerał Maryjanaŭ a. A. Cikota, prad swaim wyjezdam z Rymu, byŭ pryniaty Papiežam na prywatnaj audyjencyi.

Świačeńni. Padčas Kalad pawodle staroha stylu biskup dr. M. Čarnecki paświaciŭ u Dubnie na dyjakanaŭ Źmitra Filipowiča i Jana Hermaciuka, haduncoŭ Papieskaj Uschodniaj (unijackaj) Seminaryi. Abodwa nowyja dyjakany — biełarusy.

Z uspaminaŭ ab św. p. Ks. Fr. Hrynkiewiču. U češć niadaŭna pamioršaha Ks. Fr. Hrynkiewiča ŭ Horadni maje wyjšci knižka. Woś ža ŭ henuju knižku prysłaŭ ab niabožčyku swaje ŭspaminy biskup M. Rejnis, blizki seminaryjny i akademicki jaho tawaryš. Z uspaminaŭ henych widać, što Ks. Fr. Hr., budučy studentam Akademii ŭ Pieciarburzie, byŭ užo świedamym biełarusam i ŭ 1905 h. na adnym studenskim sabrańni čytaŭ lekcyju ab biełaruskaj sprawie.

Pryjezd u kraj a F. Abrantowiča. Dawiedwajemsia, što a. archimandryt F. Abrantowič u pałowie sakawika siol. h. z Charbinu wyjaždžaje ŭ Eŭropu. Adwiedaje tak-ža Wilniu i Druju.

Chwaroba J. Byliny. Dawiedwajemsia, što apošnim časam pawažna zaniamoh wiedamy biełaruski bajkapiśmieńnik Janka Bylina (Ks. J. Siemaškiewič) i znachodzicca ciapier na lekach u Zakapanym. J. Bylina chwareje na hrudzi.

Kaścielny chor raźwiwajecca. Ad niekatoraha času, jak wiedajem, u kaściele św. Mikałaja ŭ Wilni na nabaženstwach dla biełarusaŭ pad kiraŭnictwam hram. A. Stepowiča piaje biełaruski chor. Woś-ža z pryjemnaściaj treba adznačyć, što chor hety robić widawočnyja postupy.

Parafijalnaja statystyka. Wil. Arcybiskup zahadaŭ dziekanam zrabić statystyku parafijan swaich dziekanataŭ. U henaj statystycy jość rubryka i dla biełarusaŭ. Nadta mahčyma, što henaja rubryka budzie zapoŭniena biaz wiedama samych ludziej i tady trudnaja rada, ale kali-b probaščy pytalisia ludziej, dyk niachaj-ža biełarusy kataliki zabuducca ab „polskaj wiery," a pišacca biełarusami katalikami.

(*„Chr. Dumka" Nr. 2. 1934 h.*)

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Конфэрэнцыя сяброў Беларускага Вучыцельскага Саюзу ў Наваградку. Дня 3 г. м. адбылася нарада ў Наваградку мяйсцовых беларускіх вучыцялёў з удзелам дэлегатаў вучыцялёў Віленскай Бел Філіі Дзярж. Гімназіі ім. Ю. Славацкага — грам. В. Грышкевіча і М. Ільяшэвіча. На гэтай нарадзе між іншым пастяноўлена ўступіць у Беларускі Прафэсыянальны Вучыцельскі Саюз у Вільні.

Даведваемся, што Наваградзкія вучыцялі, якія дасюль ня былі сябрамі Бел. Праф. Вуч. Саюзу ў Вільні, цяпер у гэты Саюз увайшлі, творачы ў Саюзе пэўныя зьмены.

Зьмены ў Прэзыдыуме Беларускага Прафэсыянальнага Вучыцельскага Саюзу ў Вільні. Адначасна з уваходам у Бел. Праф. Вуч. Саюзу ў Вільні вучыцялёў Наваградзкай Беларускай Філіі Дзярж. Гімназіі ім. А. Міцкевіча, дасюлешні старшыня гэтага Вучыцельскага Саюзу ў Вільні п. Антоні Луцкевіч „падаўся" ў адстаўку, а на старшыню Саюзу выбраны др. Б. Грабінскі.

Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы пры Віленскім Унівэрсытэце 18 г.м. ладзіла беларускі рэфэрат на тэму тэму „Беларуская этнографія за 15 гадоў (1918—1934). Рэфэрат прачытаў абс. М. Пецюкевіч.

З выдавецкае нівы. Выйшлі з друкуі *„Jak palepšyć žyćcio sialanstwa"* А. Баброўскі. Вільня 1934. Брашура 16 бачын „Беларускай Народнай Бібліатэкі" № 5 і *„Прамова пасла Ф. Ярміча"* на паседжаньні Сойму 3 лістапада 1933 г.

U zali Biełaruskaha Instytutu Hasp. i Kultury, Wilnia, Zawalnaja wul. 1—1, dnia. 25 lutaha 1934 h. adbudziecca

WIEČAR

pryświačany 5-tym uhodkam wydawiectwa „Šlachu Moładzi".

U prahramie wiečaru:

1. Sprawazdaŭčy referat z dziejnaści Red-kal. „Šl. M." za 5 h.
2. Biełaruskija Narodn. Pieśni ŭ wykanańni Bieł. Choru pad kiraŭnictwam hram. Al. Stepowiča.
3. Solo na skrypcy.

Uwachod wolny. Pačatak a hadz. 19.

Z šapkaj-niawidkaj u stalicy.

Jak tolki abrydła mnie taptacca na „radzimym" śmietničku, sieŭ ja na araplan i pačaŭ lotać pa ŭsim świecie. Wiedama, ničoha nie kaštuje, bo-ž ciabie nichto nia bačyć! Pryčepišsia na kresła pustoje, a to i pad kresła dy nosišsia wichrom-małankaj, tak, što wiedźmu na miatle dahoniš i pierahoniš.

Ablotaŭ Honolulu, Kubu, Jawu, Liberyju i, wiartajučysia da chaty, zalacieŭ padarozie ŭ adnu stalicu samadziaržaŭnaj respubliki (jość i takija!), što zawiecca Hora-Dyktatoryjaj.

Bačyŭ tak šmat, što ŭsiaho nie pieraskažaš. Apišu tolki moj apošni wizyt u Ministerstwie Kalonijaŭ Hora-Dyktatarskaj Respubliki. Papraŭdzie heta nawiet nia jość asobnaje ministerstwa, a tolki kalonijalny addzieł pry ministerstwie.

Mieŭ ja takoje ščaście, što papaŭ na adno zakrytaje pasiedžańnie, jakoje mianie asabista wielmi zacikawiła.

U niewialikaj zali, dzie była narada, usie ścieny byli zawiešany rožnymi mapami i diahramami. Najbolšaja mapa mieła zahałowak: Etnohrafičnaja karta plemia Miam-Niam. Była jana našpikawana ŭ rožnych punktach miniaturnymi ściažkami rožnych koleraŭ, jakija abaznačali miascowaść z założanymi kulturnymi jačejkami dziaržaŭnaj nacyi. Ściažki čornyja aznačali niedabityja arhanizacyi Miam-Niamcaŭ. Tut ja i dahadaŭsia, što papaŭ u światoje światych kalonijalnaj palityki.

Na pawiescy dnia stajaŭ tolki adzin punkt: Sprawa likwidacyi narodnicka-wyzwalenčaha ruchu plemia Miam-Niam. Schodku „zahaiŭ" sam ministar. Mieŭ minu surowuju, lepš skazać wostra kisłuju, byccam žawaŭ limon. Adrazu widać, što byŭ heta siabra gabinetu ciažkoj ruki i wostraha kursu. Hawaryŭ jon ab tym, što schodka biazumoŭna sekretnaja i maje na mecie, nie ahladajučysia na srodki, ŭzmacnić Hora-Dyktatoryju. Na kančatak skazaŭ: „Da takoj mety my dojdziem pieradusim darohaj pawolnaj i zamaskawanaj asymilacyi plemia Miam-Niam tak, što jany sami nie ahledziacca, jak heta stanie. Ciapier daju hołas sprawazdaŭčy načalniku Addziełu Misteru Suchi-Penpeck'u."

Mister Suchi Penpeck kašlanuŭ, wyprastawaŭsia, wypučyŭ hrudzi, kinuŭ pahlad pahromščyka lwoŭ i ŭračystym hołasam pačaŭ:

„Ekscelencyja i pawažanyja Pany. Na maju dolu wypała pryjemnaść dałažyć Wam ab tych wialikich zdabytkach našych za apošni hod pry likwidacyi buntarskaha ruchu Miam-Niamcaŭ. Adnym z najbolšych našych paśpiechaŭ heta toje, što sumiežnaja dziaržawa Dreń-Dyktatoryja, jakaja zaŭsiody nam nawiawała tworčyja dumki, ciapier u zakranutaj sprawie całkom z nami supracoŭničaje, bo i jana z hetymiž niaŭdziačnymi Miam-Niamcami maje jašče horšy kłopat. Supolnaść intaresaŭ zmušaje nas uzhodnić kalonijalnuju palityku i nawiazać bratnija adnosiny, bo-ž stajali my pierad toj samaj niebiaśpiekaj. Chaču wieryć, što naša sprawa ŭ nowych abstawinach budzie raźwiwacca šyrej i hłybiej i naša misija, — pryspasobić dzikunoŭ da našaj wysokaj kultury, — budzie wypaŭniena pa dumcy našych hienijalnych poetaŭ i myślicielaŭ. Dziela hetaj mety i nadalej my pawinny trymacca wyprabawanaj taktyki, heta znača: hwałtu jaknajmieniej, zatoje dawać im usie wolnaści na papiery, prykidywacca najlepšymi pryjacielami Miam-Niam i, što najważniej, pierakupliwać ichnich ludziej, kab jany rabili našu rabotu. Praktyka pakazała što podkupy Miam-Niamcaŭ na dziaržaŭnym budžecie ani kapli nie zawažać. Jany — plemia biednaje, swaich maharadžaŭ nia majuć, bosyja i hałodnyja, dyk znachodziacca takija, što možna kuplać hurtam i ŭ rožnicu prosta na centy, badaj što na darmawika. A dla inšaha, dyk i abiacanki chapaje. Hetyja kuplenyja niawolniki časami adchilajucca ad wyznačanaj linii, tady tworym inšuju hrupku kuplenych Miam-Niamcaŭ, jakaja pa ich bje i licytujecca ŭ lakajstwie. My idziom pa staroj maksymie „Divide et impera," ci kažučy pasučasnamu: usiudy tasujem da hetych dzikunoŭ dywersyjnuju palityku".

Doŭha jašče hawaryŭ dakładčyk, pierakonywaŭ, pakazywaŭ adumysłowyja diahramy i kartahramy, apracawanyja ŭ ustanowie, jakuju anhlijcy nazywajuć „Inteligence Service" ci niejak padobna. Paśla pačalisia dakłady z miascoŭ. Dakładčyki z rožnych kantonaŭ, departamentaŭ i akruhoŭ padrabiazna raskazwali ab swajej pracy i padawali ahulnyja wywady.

Hetak dakładčyk z departamantu Bałotnaha Niačyścika infarmawaŭ, što jahony šef sprawu raźwiazaŭ prosta: abjawiŭ Miam-Niamcaŭ, što jany toje samaje plemia, što i my. Takim čynam usio budzie dobra, tolki — kaža — ničoha nia treba rabić, kali nia ličyć tej raboty, što kožnaha, chto siabie nazawie Miam-Niamcam, pazwać u adpawiednaje miesca i ŭsypać nahoła.

Dakładčyk z departamentu Biełaha Kija infarmawaŭ, što ŭ ich robicca pawodle ŭsich wymahańniaŭ dyplomacyi, adno haworycca, a zusim praciŭnaje robicca. Wialikuju rolu adyhraŭ tam uhadowiec zamaskawany — Mister Nicolai. Tam — kaža — my tak nakrucili, što i sam Belzebub nie raskrucić.

Dakładčyk z departamantu Žaleznaha Waŭka abhawarywaŭ, što tam pabity rekord uhadowaści i pradažnaści. Prosta niemahčyma adahnacca ad uhadoŭcaŭ, lezuć praz dźwiery i wokny, choć ty sabakami ckuj. A kožny maje swaju hazetu i chluskaje pamyjami na taho, kaho ŭčora chwaliŭ. Apošnimi časami wielmi pa schodnaj canie my kupili nowuju ptušku Sinicu. Čyrykaje dawoli nachalna, — pahladziom, što dalej budzie. Kali tak pojdzie dalej u našym departamancie, najbolš kaliś buntarskim, ad Miam-Niamcaŭ astanucca tolki rožki dy nožki — zakončyŭ dakładčyk departamantu Žaleznaha Waŭka.

Pa dakładach była wyniesiena rezalucyja mienš-bolš duchu pramowy Mistera Suchi-Penpecka. Prasłuchaŭšy jaje, nia wytrymaŭ ja. Padyjšoŭ da piečki, wyniaŭ wuholčyk i na wačach usich čyrkanuŭ pa biełaj ścianie wałowymi literami: *Čaławiek stralaje, a Boh kuli nosić.*

Prysutnyja ŭbačyŭšy, jak sam wuhol piša na ścianie, raźbiehlisia z pierapudu pa ŭsich pakojach. Ja padyšoŭ da stała i toje samaje napisaŭ pad tolki što napisanaj rezalucyjaj ab sposabie likwidacyi biednaha plemia Miam-Niam.

Na druhi dzień, ja biez šapki-niawidki, pierapranuŭšysia ŭ adziežu Miam-Niamca, adwiedaŭ taho-ž ministra i zažartawaŭ, byccam mianie delehawali sami Miam-Niamcy.

— My hołyja, bosyja i hałodnyja — kažu ja, — nia majem ni chleba ni aświety ŭ matčynaj mowie, dajom padatki, ale ničoha nie biarom! Dzie waša honorowaje słowa? Dzie našy prawy, jakija wy napisali na papiery?

Ministr chapiŭ mianie za ruki i wietliwa pramowiŭ:

— „Rodnieńki ty moj, usio budzie, tolki krychu pačakajcie. My nie takaja rasa, kab Was kryŭdzić. Hlańcie ŭ našu historyju. Na praciahu jaje wy biez kanca bačycie tolerancyju, tolerancyju i jašče raz tolerancyju. Heta ŭžo pływie ŭ našych žyłach. Woś učora, naprykład, my na adumysłowym źjeździe cely dzień radzili i naradzili, jak wam pamahčy. Wiartajciesia da chaty i skažycie ŭsim, kab tolki ŭmieli čakać i bolš ničoha."

I na raźwitańnie mnie mocna mocna ścisnuŭ ruku.

K. Hryboŭski.

Hoład u Zach. Biełarusi.

My ŭžo nia raz pisali ab hoładzie ŭ Dzisienskim, Brasłaŭskim i Postaŭskim pawietach. Pawodle abličeńniaŭ na woka ŭ hetych pawietach užo haładuje bolš 80.000 asob. Pry hetym pahražaje hoład i ŭ pawietach Świancianskim, Maładečanskim, Wialejskim i Wałožynskim. Pahražaje tak-ža hoład i ŭ Nawahradzkim wajawodztwie, u susiedztwie z Palessiem, dzie ŭžo sialanie haładujuć.

Pryčyny hoładu: hałoŭnaja—nieŭradžaj, a tak-ža adsutnaść ekanamična-haspadarčaj arhanizacyi.

Niaŭdača socyjalistaŭ u Aŭstryi.

U Aŭstryi, jak my padawali ŭ prošłym numary, 11 i 12 h. m. wybuchnuła susim nieŭspadziešuki rewalucyja Rewalucyju pačali socyjalisty, jakim nie padabajecca ciapierašniaja, pakatalicku arjentujučajasia dziaržaŭnaja ŭłada, jakuju reprezentuje stojačy na čale ŭradu kancler Dolfus. Sučasnuju ŭładu ŭ Aŭstryi padtrymliwaje ŭsiocela i palityčny aboz nacyjanalistyčna-sialanskaj dumki, jaki reprezentuje ŭ uradzie pobač kanclera Dolfusa zastupnik kanclera — Fej. Hety apošni i patrebawaŭ raźwiazańnia socyjalistyčnych bajawych arhanizacyjaŭ, što i stałasia farmalnaj pryčynaj wystupleńnia socyjalistaŭ procíŭ ciapierašniaj dziaržaŭnaj ułady.

Maleńkaja aŭstryjackaja respublika ŭstrasłasia. Razruchi pačalisia ŭ horadzie Lincu, dzie palicyja wykryła socyjalistyčny skład aružža, — i kali chacieła henaje aružža skanfiskawać, socyjalisty wystupili suproć palicyi z aružžam. Adrazu niekalka asob zabita i mnoha ranienа. U Wienie adnačasna wybuchnuła ahulnaja zabastoŭka; wializarny horad apynuŭsia biez komunikacyi i biaz chleba. Na wulicach horadu paŭstali barykady i pačałasia chatniaja wajna pamiž socyjalistami z adnaho boku i palicyjaj i wojskam z druhoha boku.

U hetaj krywawaj baraćbie socyjalisty zdalisia; pawadyry socyjalistaŭ uciakli zahranicu, u Čechasławaččynu, a radawyja baraćbity za teoryju Marksa zdalisia palicyi i wojsku. Paśla takoha socyjalistyčnaha projhryšu masa socyjalistaŭ aryštawana. Niekatorych wajenny sud zasudziŭ na karu śmierci. Takim čynam socyjalisty ŭ Aŭstryi mocna i wielmi baluča prajhrali, a treba wiedać, što Wiena — heta-ž najsilniejšy dasiul byŭ eŭrapejski centr socyjalizmu.

Rewalucyjnyja padziei ŭ Francyi.

Nadowiačy ŭ Francyi adbylisia pawažnyja rewalucyjnyja padziei. Ab hetych padziejach my ŭžo padawali i da ich jašče wiartajemsia.

Sapraŭdnaj pryčynaj rewalucyjnych zawarušeńniaŭ u Francyi źjaŭlajecca haspadarčy kryzys, niaŭdačy lewicowaha ŭradu ŭ zahraničnaj palitycy i kompromitacyja lewych uradaŭ aferaj Stawiskaha, protekcyjanizm i korupcyja.

Hetu rewalucyju wykarystali ŭ Francyi prawicowyja arhanizacyi — respublikancy i manarchisty.

Z hetych zawarušeńniach skarystali i kamunisty, jakija siarod uzbuŕanych masaŭ pačali prawodzić swaju ahitacyju. U Paryžy pačalisia krywawyja sutyčki. Adnak palicyja ich uśmiryła.

U wyniku krywawych padziejaŭ dajšło da hieneralnaj zabastoŭki, u Paryžy nawat telefon i telehraf pierastali funkcyjanawać.

U wyniku hetych zawarušeńniaŭ urad Delad'era, jaki susim niadaŭna pryšoŭ da ŭłady, byŭ prymušany padacca ŭ adstaŭku, a na jaho miesca zasieŭ nowy ŭrad, z b. prezydentam Francyi Dumergam na čale.

Z ZAHRANICY.

Prociŭžydoŭski front u Eŭropie. Žydoŭskaja hazeta „Moment" padaje: Tajny biuleteń nacyjanal.-socyjalistaŭ „Weltdienst", jaki wychodzić u troch mowach, zaklikaje ŭsie pro ciŭžydoŭskija arhanizacyi ŭ Eŭropie da stwareńnia mižnarodnaha prociŭžydoŭskaha sajuzu. U hety sajuz majuć uwajści, piša „Moment", rumynskaja „Żeleznaja Hwardyja", polski „Rozwój", hreckaje E.E.E.", finskaje „Lappo" i nac.-socyjalisty dy ich sympatyki inšych krajoŭ. Biuleteń padčyrkiwaje, što „niežydoŭski świet nia bačyć žydoŭskaj niebiaśpieki. Stwareńnie eŭrapejskaha prociŭžydoŭskaha frontu adkryje świetu wočy na žydoŭskuju niebiaśpieku".

Sawiecka-polski sajuz na 10 hadoŭ. Jak wiedajem, Sawiety z Polščaj zakľučyli dahawor ab nienapadańni na 5 hadoŭ. Ciapier, paśla pajezdki polskaha ministra Bekka ŭ Maskwu, jak padajuć hazety, hety dahawor pradoŭžycca da 10 hadoŭ. Słowam, družba pašyrajecca i pahłyblajecca.

Kamunisty ab sabie na 17 źjeździe. Na 17 źjeździe Kompartyi SSRR sam Stalin skazaŭ, što sialanskaja haspadarka ŭ Sawietach upadaje: Pasiеŭnaja płošča: u 1932 h. pasieŭnaj płoščy było 134,4 mil. hekt., a ŭ 1933 h. upała jana na 129,7 mil. hekt. Sprawa z skacinaj jašče horšaja: u 1929 h. koniaŭ było 34 miljony, a ŭ 1933 h. užo tolki 16 miljonaŭ. Rahatej skaciny ŭ 1929 h. było 68 mil., a ŭ 1933 h. 38 miljonaŭ. Awiec i kozaŭ było ŭ 1929 h. 147 mil., a ciapier zastałosia tolki 50 miljonaŭ.

Staršynia kantrolnaj kamisii kamunistyčnaj partyi Jarosławski pawiedamiŭ 17 źjezd, što kompartyja za 2 apošnija hady padała ŭ partyjny sud 40.000 swaich siabroŭ. Z hetych 40 tysiač kamunistyčnych hrecharodnikaŭ partyjny sud wykľučyŭ z partyi 16 tysiač. Rešta kajalisia i nawiarnulisia.

Za kamunistyčny hrech, nacyjanalizm, kompartyja pakarała praklaciem 2.100 asob.

Śmierć belhijskaha karala. Nadowiačy Belhijski karol Albert wybraŭsia ŭ hory na spacyr i tam zwaliŭsia z wysokaj skały ŭ prorwu, raźbiwajučy sabie śmiartelna haławu.

ZWILNI.

Ukrainskaje pradstaŭleńnie. U minułuju niadzielu 18 h. m. adbyłosia ŭ Wilni ŭkrainskaje pradstaŭleńnie. Ładzili jaho ŭkrainskija studenty wilenskaha ŭniwersytetu. Ihrali operetku „Oj ne chody Hryciu" — u pryhožaj ukrainskaj narodnaj wopratcy, dajučy bahatuju ŭkrainskuju narodnuju pieśniu, rytmična-badziorуja i wiasioła-zawadyjackija ŭkrainskija narodnyja tancy i ŭkrainskija narodnyja kaladnyja zwyčai. Słowam, ukrainskija studenty zademanstrawali kulturu swajho narodu prad wilenskim hramadzianstwam naležnym sposabam i ŭ adpawiednym miescy.

Pry hetym nielha nie skazać, što wykanańnie hetaj pryhožaj operetki dawoli dobraje, tym bolš, što na scenie jhrali amatary.

Bačačy kulturna-hramadzkuju pracu ŭkrainskich studentaŭ U.S.B., chočacca žadać, kab jana była prykładam i dla našaha, biełaruskaha studenstwa.

Kanfiskata „Vilniaus Rytojus". Numar 14 sioł. h hetaj časopisi administracyjnyja ŭłady skanfiskawali za deklaracyju Litoŭskaha Tymč. K-tu ŭ Wilni ŭ sprawie apošnich aryštaŭ Litoŭcaŭ.

Solidarnaj zabastoŭki nia było. Wilenskija socyjalisty byli abwieściŭšy na poŭhadzinu zabastoŭku dzieła wyjaŭleńnia solidarnaści z socyjalistymi ŭ Aŭstryi. Heta zabastoŭka adnak nie adbyłasia. Widać socyjalisty na rabotnikaŭ nia majuć užo wialikich upływaŭ.

Achwiary na płatu za nawuku niezamožnych wučniaŭ biełarusaŭ.

Prezydyjum Biełaruskaha Praf. Wuč. Sajuzu atrymała hrašowyja achwiary na niezamožnych wučniaŭ Biełaruskich Filijaŭ Dziaržaŭnych Himnazijaŭ u Wilni i ŭ Nawahradku ad nastupnych hramadzian:

Dr. B. Hrabinski—20 zł., A. Łuckiewič—10 zł., Inž. A. Trepka — 10 zł., J. Šnarkiewič — 5 zł., W. Hryškiewič—5 zł., Uļ. Mankiewič — 5 zł., X. X.— 100 zł, Dr. Syran—50 zł., J. Stepowič—5 zł., J. Muraška—2 zł., J. Hapanowič — 40 zł., Wučyciali Biełaruskaj Filii ŭ Wilni — 133 zł. 90 hr. Razam — 385 zł. 90 hr.

Usie hrošy addany na padanuju achwiaradaŭcami metu. Prezydyjum Biel. Wuč. Praf. Sajuzu pieradaje ŭsim uspomnienym achwiaradaŭcam ščyruju padziaku.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Nahłyja sudy majuć skasawać. U senackaj budžetnaj kamisii padčas dyskusii ministr sprawiadliwaści zajawiŭ, što na najbližejšaj naradzie ministraŭ padaść prajekt skasawańnia nahłych sudoŭ. Heta sprawa naležyć da wyrašeńnia Rady Ministraŭ.

Amnestyja. Ab wiestkach, što maje być u Polščy amnestyja, my ŭžo padawali. Hazety pišuć, što heta amnestyja budzie abwieščana ŭ sakawiku.

Administracyjnyja kary. Pawodle statystyki, wa ŭsiej Polščy ŭ minułym hodzie było 1.015.579 administracyjna-karnych spraŭ za roznyja prastupki. Najbolš prastupnikaŭ sanitarnych i pjanstwa.

Biezrabоćcie. Z Waršawy padajuć: Na dzień 10 h. m. biezrabotnych wa ŭsiej Polščy zapisana 404.029 asob. Za tydzień biezrabоćcie ŭzrasło na 2127 asob.

Cana dalara ŭpała apošnim časam da 5 zł. 35 hr.

Z KRAJU.

Fałšywyja hrošy. Apošnim časam u Wilni i na prawincyi pajawili sia 2, 5 i 10 złotawyja manety. Falsyfikaty hetyja pawodle hazetnych wiestak pachodziać byccam z Brasłaŭščyny.

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу! Выпісвайце найстарэйшую беларускую газэту „Беларуская Крыніца," і коопэратыўную часопісь „Самапомач."

Dr. St. Hrynkiewič.

Sypny tyfus.

Pamiać čaławieckaja niawiečnaja. Słańnieśniaja złybiada zaŭtra ŭžo astaniecca niedzie daloka ad nas, ab joj my zabywajemsia susim. Tolki što zdajecca ŭsie my žyli dumkami ab sypnym tyfusie. Heta było nadta niadaŭna, pomnim usie paru waj ny, paru pawarotu ŭciekačoŭ z Rasiei. Hetulki pastahnali ŭ dezynfekcyi polskaj ci niamieckaj.

Kwarantany, dezynfekcyja mieli tady na ŭwiecie amal nia wykľučna chwaroby zaraznyja, jakija pieranosić woš, kłop, dawoli redka błycha.

Da hetkich nadta niebiaśpiečnych chwarobaŭ u pieršuju čarhu naležyć sypny tyfus. Sypny tyfus wyklikajecca mikroorhanizmami Rickettsia-Prowazeki. Pieranosiać-ža henyja bakteryi wošy. Woš, jakaja nasmaktałasia krywi chworaha na tyfus sypny, moža za 5—7 dzion, ukusiŭšy druhoha čaławeka, zarazić jaho chwarobaju. Pobač wošaŭ mohuć raznosić henuju chwarobu błochi, kłapy. Dyj chwaroba sypnoha tyfusu idzie ŭ śled za pošaściami hoładu, wajny dy inšych ahulna hramadzkich niašćaściaŭ.

Kali-ž majem henuju chwarobu biaz henych asabliwych abstawinaŭ, dyk pakazwaje heta tolki na błahija ŭmowy sanitarnyja, na małuju rupliwaść ab čyściniu. Dzieła hetaha sypny tyfus mała wiadomy abo susim niewiadomy na Zachadzie Eŭropy, a wielmi raspaŭsiudžany na Uschodzie.

Chwaroba pačynajecca raptoŭna z trascaju, paśla jakoje zaraz prychodzić haračka ŭ chworaha, bol haławy, boli ŭ nahach, pajaśnicy, słabaść. Na 3—7 dzień ad pačatku chwaroby wysypka na skury žywata, hrudziej, plečaŭ, noh; wysypka ružowafijaletawaja ŭ formie plamak maleńkich, byccam niechta ich nasypaŭ z pryhorščaŭ (tamu i tyfus sypny).

Dawoli časta bywaje suchi kašal. Serca mocna asłabwaje i moža susim spynić swaju dziejnaść u henuju paru chwaroby.

Na 14—18 dzień ad pačatku chwaroby ŭsieńka prachodzić dawoli chutka, chwory wiartajecca da zdaroŭja.

Kali ŭ wyšej pamianionych plamkach pakažycca kroŭ, možna spadziawacca błahoha kanca Na žal heny błahi kaniec u sypnym tyfusie dawoli časty.

Jak u kožnaj chwarobie, asabliwa ŭ tyfusie sypnym, najwažniejšaju zadačaju zmahańnia z chwarobaju — nie dapuścić jaje da siabie. A dzieła hetaha treba baranicca ad wošaŭ i kłapoŭ.

Jošč niekalki widaŭ wošaŭ: wopratnianaja (što siadzić i kładzie jajećki na wopratcy), hałaŭnaja (siadzić na wałasoch haławy) i treci wid, jaki žywie na orhanach płočnych, a lepš na wałasoch henaje wakolicy. Wiedajem, što woš kormicca kroŭju čaławeka. Ukusiŭšy chworaha čaławeka i ŭsmaktaŭšy z jaho krywioj bakteryi sypnoha tyfusu, taja samaja woš, kusajučy paśla niekalki ci niekal kinaccaci dzion zdarowaha čaławeka, zarazić jaho. Kali i nia ŭkusić, a tolki zdarowy čaławeк razdušyć — chočučy ci nia chočučy—zarażanuju woš, i hetaha dawoli, kab bakteryi ŭtrapili ŭ kroŭ i čaławeк zachwareŭ.

Dyk, kab nie chwareć na tyfus sypny, treba ściarahčysia ad wošaŭ. Biaz ich niama chwaroby. Čaławeк, jaki rupicca ab čyściniu siabie samoha i kala siabie, wypadkowa moža dastać wošaŭ u dachu, ad čužoha čaławeka, pieranaŭšaha ŭ chacie i h. d.

Pamieškańnie ačyščajecca ad wošaŭ, wymyŭšy padłohu i chatnija prylady haračaju wadoju z sodaju ci łuham. Chuśćio ačyščajecca susim zdawalniajuča, kali budzie jano waryсca ŭ wadzie z 1/2 hadziny.

Kali idzie ab toje, jak ačyścić wašywaha čaławeka, dyk treba trymacca hetkich prawiłaŭ: 1) koratka abstryhčy wałasy, 2) wykupacca, najlepš u biełuchaj wadzie ci pad pyrskinicaj, nie škadujučy pry hetym myła, 3) kali wošy (hnidy h. zw. jajećki wošaŭ) byli na wałasoch — šmarawać hazaju haławu i pad pachami; na wałaśsio na saromliwych orhanach lepš uziać šeruju maść, 4) wykupaŭšysia i namazaŭšy wyšej pakazanymi lekami, treba čysta apranucca i ŭziać čystaje paścielnaje chuśćio.

Kali na niaščaście niechta ŭžo zachwareŭ, dyk treba jaho biezadkładna izalawać (addzialić ad zdarowych), addajučy najlepš da lakarni, a prynamsia kładučy jaho ŭ ščylna addzielenuju kamorku. Chworaha i ŭsich, chto mieŭ z im adnosiny, treba wykupać, abstryhčy i h. d. Ačyścić chatu. Kali ŭ chacie zachwareŭšaha byli małyja dzieci, nia puskać ich u škołu, na wulicu, ahulam treba, kab usie blizkija da chworaha byli aściarožnyja ŭ adnosinach da ludziej.

Mahčymaści samoha lačeńnia dawoli skromnyja. Zdarowy, mocny čaławeк pieramoža chwarobu. Pry wysokaj haračcy dawać lod abo chałodnyja kampresy na haławu. Dobra, kab rabić kožny dzień ciopłyja wanny z paliwańniem haławy chałodnaju wadoju.

Pry kašli abo słabaści tyja samyja leki, što i pry brušnym tyfusie.

Piśmy z wioski.

Polonizacyjnyja natuhi.

Kieziki, Postaŭskaha paw. Usia naša wakolica abciahnuta hustoj sietkaj polskich arhanizacyjaŭ: „Stralec," „Zw. Mł. W.," „St. Mł. Polskiej." i inš. Usie hetyja arhanizacyi majuć charaktar čysta polski, jakija ŭwajšoŭšych tudy biełarusaŭ apalačywajuć. Na ŭsiu našu wakolicu jość tolki adzin hurtok swajej rodnaj arhanizacyi — hurtok Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ w. Charkoch. Z hetaha hurtka naša moładź čerpaje swaju rodnuju biełaruskuju duchowuju pažywu; dastaje biełaruskija hazety i knižki, a tak-ža čas ad času čuje i żywoje biełaruskaje słowa ab rodnaj kultury i ab patrebie praświety. Moładź naša ŭžo horniecca da swajej rodnaj arhanizacyi i achwotna źbirajecca na publičnyja biełaruskija lekcyi. Biada z starejšymi, jakija čamušci nadta bajacca palicyi i dziela hetaha staroniacca ad biełaruskich sabrańniaŭ, kab ich nie zapisaŭ u „knižku" palicejski. Każuć, što tady nia ŭsciеražešsia ad pratakołaŭ i strataŭ. Ale ŭ praktycy tak bywaje, što strašać taho, chto baicca.

Saŭka.

Z żyćcia našaj staronki.

Jakieleŭščyna, Ašmianskaha paw. Heta maleńkaja wiosačka kala wiedamych Župran, słaŭnych pamiatkami i mahiłaj Baćki biełaruskaha narodnaha adradżeńnia Franciša Bahuševiča. Zdajecca, što staronka heta, jakaja zradziła i ŭzhadawała Fr. Bahuševiča, pawinna wiedać ab jaho duchowaj spadčynie dla Biełarusoŭ i pawinna Jaho dumki dalej prawodzić — da woli, da ščaścia, da poŭnaj samabytnaści Biełaruskaha narodu.

Ciomnaja chwala narodnaj niaświedamaści akutała staronku, dzie čerpaŭ sabie natchnieńnie naš narodnik—piaśniar Fr. Bahuševič. Narod atumanili polskija ksiandzy, zabiwajučy ŭ im biełaruskaje narodnaje pačućcio, nakidwajučy narodu paniaćcie „polskaj wiery" na miejsca wialikaj idei Katalickaha Kaścioła. Biełaruskaja mowa ŭ hetaj staroncy z Kaścioła, hminnaj kancelaryi, z škoły i padobnych aficyjalnych miajscoŭ wyhnaha; u hetych instytucyjach aficyjalna haworać tolki papolsku. Polski šowinistyčny duch praz niby katalickuju arhanizacyju S M.P. i druhija imkniecca, kab wydzierci z wusnaŭ našu biełaruskuju mowu i ŭ chacie; polskija kultur-tregiery nahawarywajuć, asabliwa moładź, kab i ŭ chacie hawaryli papolsku. U padmohu wusnaj ahitacyi dajecca ŭ ruki našamu narodu polski nacyjanalistyčny „Naš Pšyjaciel" i „Rucz". Suproć hetaj akcyi polskaha źwiarynaha nacyjanalizmu borycca tolki „Biełaruskaja Krynica," jakaja prychodzić u našu wiosku, ale papadajecca ŭ ruki čytača wielmi nierehularna. Prychodzić tak-ža kali-niekali i „Chryścijanskaja Dumka."

Pry hetym treba adznačyć i baraćbianyja prajawy našaj staronki. Nadzieja naša — heta maładyja školniki. Jany i biaz rodnaj škoły, bo ŭ čužoj, a tolki pry pomačy rodnaj knižki stanowiacca da baraćby z polonizacyjaj; jany za swaju biełaruščynu cierpiać nia tolki ŭ škole, ale i ad niaświedamych baćkoŭ u chacie. Siarod hetaj moładzi nacyjanalnaja świedamaść raście šyroka i hłyboka. Hetaj moładzi patrebny tolki knižki, a dalej jana sama znachodzić darohu.

Siarod starejšych panuje niejkaje źnieachwočańnie da ŭsiaho. A hetamu pamahaje haspadarčy kryzys, jaki, byccam pamocnik sekwestratara, z wioski i nia wyłazić. Nadowiačy pobač z kryzysam adbyŭsia ŭ nas i sekwestr; za padatki sekwestratar zabraŭ usio, što tolki moh.

Narod naš adnak nia padaje ducham i čakaje pieramieny, čakaje lepšych časoŭ. Na moj pahlad tolki čakać nia można, a treba i pracawać, bo čakańniem dabra nie dačakajemsia. Treba praświačacca i ŭświedamlacca.

Ša.

Бацюшка супроць беларускай мовы.

Чэрэса, Браслаўскага пав. У нас усе беларусы, але народ цёмны. З цемнаты народу карыстае кожны прахадзімец. Калядамі нашы сяляне—прыхаджане Чэрэскай цэрквы— падалі падпісы, каб сьвяшчэньнік у царкве гаварыў пропаведзі па нашаму, пабеларуску і каб пабеларуску навучаў нашых дзяцей у школе Закону Божага. Людзі падпісалі гэткае дамаганьне, бо гэтага жадаюць. Але вось не спадабалася гэта нашаму а. духоўнаму Сьвітічу. Яго жонка напісала, што прыхаджане Чэрэскія ня хочуць беларускай мовы і надта-ж любяць мову маскоўскую, а айцец духоўны даў сваім падлізам гэтую пападзьдзіную пісульку падпісаць. Такім чынам наш поп маскаль з жонкай пачаў утрымліваць у царкве маскоўшчыну.

Браты—Чэрэскія прыхаджане! За такія адносіны да нас папа-маскаля ня дайма яму ані граша ахвяры. Мы беларусы і нам патрэбны сьвяшчэньнік беларус, які ведае нашу мову і па нашаму будзе да нас гаварыць. Прэч маскоўшчыну з царквы. Даволі палітыкі ў царкве Царква—гэта Дом Божы!

В. Кавалеўшчык.

Аб будове царквы.

Дзятлава, Наваградзкага пав. Наша старэнькая дзераўляная цэркаўка ад старасьці пахілілася на бок і пагражае, што паваліцца. Трэба правіць гэту старую або будаваць новую. Аб гэтым летась гаварыў няраз і наш малады бацюшка, настаяцель гэтай цэрквы. Заахвочваў ён прыхаджан, каб зьбіралі грошы, па залатоўцы ад душы, на будову новай цэрквы. Прыхаджане на гэта дзела адгукнуліся прыхільна і пачаліся складкі ня толькі ў нашым прыходзе, але і ў суседніх. Грошы аддавалі настаяцелю. Але наш бацюшка заціх і нічога не гаварыў. Вось сёлета на Каляды настаяцель „во всеуслышаніе" заявіў, што за сабраныя грошы цэрквы будаваць ня будзе, бо гэтыя грошы мусіць паслаць на рамонт Ерусалімскага храма. Вось табе і на! Грошы на цэркву ізноў трэба зьбіраць. Але хто іх будзе даваць? Але калі-б і давалі, то ўжо цяпер не папу.

С.

Царкоўнаслужыцель робіць палітыку.

Занарач, Постаўскага пав. Наш царкоўна-служыцель а. Білев стаўся такім гарачым польскім патрыётам, што хіба гарачэйшы ад самага гарачага польскага ксяндза. А што ён рабіў, як былі тут бальшавікі, — прыхаджане так-жа памятаюць. Цяпер нашы прыхаджане духовай стравы ня маюць, бо бацюшка і ў царкве гаворыць аб палітычных справах. Апошнімі часамі дык гаварыў усё аб выбарах у самаўрад; сам бацюшка актыўна працаваў у выбарах і быў кіраўніком выбараў, але не з народам. Нават стараўся быць „выбраным" у самаўрад, а каб „выбралі", дык гаварыў аб гэтым у цэркве на прапаведзі. Нашы людзі ўжо знаюць цану гэткіх дабрадзеяў і з папоўскім нагаварываньнем не пагаджаюцца. Супроць спосабаў у выбарах нашы сяляне падалі пратэст. Трэба нам дамагацца, каб сьвяшчэньнік глядзеў цэрквы і ў царкве навучаў народ Хрыстовай праўды па нашаму, пабеларуску.

Тутэйшы Беларус.

Аб жыцьці нашай старонкі.

Сідра, Сакольскага пав. Жыцьцё цяпер ашняе нашых сялян вельмі кепскае. Земляробскія продукты танныя, а фабрычныя тавары дарагія. Заработкаў няма ніякіх. Сяляне ня маюць нават зашто купіць солі, а сернікі ўжо заступае красіво. На вясну многім гаспадаром пагражае голад, бо цяпер выпрадалі збожжа па таннай цане, бароняючыся ад сэквэстратара, каб не ліцытаваў за падаткі. Аб абутку і лепшай вопратцы нашы сяляне ўжо ня думаюць: адзяюцца ў старыя лахаматкі ды латаюць у ботах латы, а найчасьцей у дзюравых ходзяць. Моладзь дарослая ня жэніцца, бо няма з чаго жыць і няма на чым працаваць. Трэба дамагацца, каб сяляне мелі зямельныя варштаты працы, бо калі гэтак будзе далей, дык амаль усе сяляне будуць беззямельныя і тады пойдуць забіраць зямлю самі.

Б. Я.

Голад на Палесьсі і пагроза голаду ў Наваградчыне.

(Ад нашага карэспандэнта з Баранавіч).

Ад самага пачатку зімы на Палесьсі пануе страшны голад сярод абяднеўшага сялянства.

Палесьсе—гэта-ж балотная старонка, дзе між балатоў рэдка раскінуты па пяшчаных вастравох вёскі. Паляшукі ворнай зямлі маюць вельмі мала, ды і тая неўраджайная—пяскі. Галоўнай апорай жыцьця ў Палешука—гэта сенакос. Але і гэтых балотных сенажацяў Палешукі ўласных вельмі мала маюць. Яны косяць сена ў паноў, пераважна ў графа Патоцкага, на часьці. Зімой гэта сена прадаюць або проста мяняюць на хлеб, а так-жа гадуюць скаціну.

Праз апошнія два гады Палешукі не касілі сена. Частыя дажджы залілі вадой лугі і сена асталося пад вадой зімаваць. Паляшуцкія сяляне папрадалі ўжо скаціну, а далей, ня маючы чаго прадаваць на хлеб, пашлі жабраваць у далейшыя ад сваіх балотаў ваколіцы. Арганізуюцца паветавыя і гмінныя дапамаговыя галадаючым камітэты, але гэта голаду сярод Палешукоў не супакойвае і Палешукі галадуюць.

Пагражае галоднай вясной і ў Наваградчыне. Летась ва ўсей Наваградчыне бульба не ўрадзіла. А бульба ў гэтай старонцы—гэта-ж галоўны прадукт. Ня зусім урадзіла і збажына. А сяляне і гэтыя крышані мусяць цяпер прадаваць, каб адчапіцца ад сэквэстратара. Дзеля гэтага сяляне хоць і астаткі, але прадаюць па такой нізкой цане, бо па 1 зл. 80 гр. за пуд жыта і па 1 зл. 40 гр. за пуд аўса.

На вясну гэта збожжа, пэўне, будзе шмат даражэйшае і аб гэтым ведаюць сяляне, бо ў сялян збожжа ня будзе, яно пяройдзе ў рукі гандляроў. Сяляне тады купіць ня змогуць і кожны селянін гэта сабе ўсьведамляе, аднак цяпер за бясцэн прадае, бо мусіць, а на вясну спадзяецца раньняй крапівы, якой прыдзецца заспакайваць голад да новага ўраджаю.

Чай.

Biełastok—biełaruski paroh.

Biełastok dla biełarusaŭ mieŭ zaŭsiody nie małoje značeńnie. Jon i ciapier dla nas z mnohich bakoŭ jość cikawym. Ja, što ŭ im żywu, nawinami z Biełastoku chaču padzialicca z čytačami „Bieł. Krynicy." Biełastok ludźmi taki samy, jak i Horadnia, abo Wilnia, ależ uznoŭ kudy nie taki samy, jak Waršawa. Woś heta nas usich najbolš i cikawić. Čamu Biełastok, choć i bliżej Waršawy, ale da jaje tak nie padobny i čamuścika hety samy Biełastok choć i dalej ad Wilni, ale da jaje zusim padobny? Adkaz na heta źjawišča budzie adzin: bo tam dalej za Biełastok, nia bolš, jak dziesiać wiorst na Zachad, užo raka Narwa, a za jeju druhi narod, narod, što da Waršawy bolš padobny!

Waršawa—stalica Polščy. Z Waršawy ŭ naš bok jeduć rožnyja ludzi—hramadzkija dziejačy. Pa darozie da nas—jany zatrymliwajucca na parozie Biełarusi, u Biełastoku.

Tut jany ahladajucca, bo jany pieršy raz tut spatykajucca z Biełarusami. U Biełastoku jany nadumliwajucca i wučacca, jak iści dalej da biełarusaŭ, jak dastacca z Biełastoku ŭ Horadniu i Wilniu.

Nam nia dziwa, što waršaŭskich palitykaŭ daroha wiadzieć z Waršawy praz Biełastok u Wilniu. Ale nam bolšaje dziwa, što pa hetaj samaj darožcy kocicca i żyćcio naša kaścielnaje. Usie našy duchoŭniki, wyšejšaj i nižejšaj rangi, jeduć z Waršawy praz Biełastok u Wilniu. Uwieś kaścielny duch biełastocki jość rodam z Waršawy. Duch heny—nam čužy i ciažka nam da jaho prywyknuć, dyk zatoje my kataliki ŭ Biełastoku ledź užo dychajem — hetak ciažka nam raźwiwać żyćcio katalickaje. A ksiandzy našy nia ŭsie hetakaje pałažeńnie naša razumiejuć. Jany, pierawažna, ruka ŭ ruku z warśaŭskimi siabrami pracujuć, kab macniejšy fundamant palityčny załažyć u Biełastoku.

Biełarus ty moj biełastocki! Choć raz Ty ŭžo pierakanajsia, što kala Ciabie, na't i ŭ kaściele, niama aniwodnaha pryjaciela, ani spahadčyka! Tady ty sam pačynaj šukać lepšaj doli ŭ żyćci swaim. Swaimi ŭłasnymi wačyma, a nie praz čužyja akulary, hladzi na biełaruski narod! Ty sam swaim rozumam i wolaj łučysia ŭ wialikuju siamju biełaruskuju, da katoraj i naš Biełastok naleža.

W. D—a.

Paštowaja skrynka.

Macur. Atrymali ale nie nadrukujem, bo ŭžo majem i zapiarečańnie Sprawu biełarusizacyi carkwy nia wyrašyć maskal świašč. Biełaruskaj mowy ŭ carkwie damahajecca narod, dyk mitusianina papa maskala tut ni pryčom.

Staradaŭni. Hetyja słowy nie Piaršukiewiča, a J. Kupały. Dziela hetaha i ŭ cełaści Waš wierš nia moža być nadrukawany. Apišycie ŭspaminy ab ks. Astramowiču, ale apišycie prozaj. Treba zwaročwać uwahu i za carkoŭnuju ahradu, bo treba-ž adtul wyhnać maskoŭščynu.

Niachwied. Dziakujem, skarystajem, ale skaraciŭšy.

Špak. Dobra, pišycie čaściej, hetu karesp. papraŭšy nadrukujem.

Paddubič. Dziakujem za prysłanaje, usio, ab čym pišacie ŭ piśmie, atrymali; Wam wysłali 10 ekz., bolš nie mahli; nia drukujem z niastačy miejsca; nie prapadzie i prydzie čas nadrukawać.

M. M. Nia radzim źwiartacca ŭ T-wa „Siaŭba," bo heta arhanizacyja kamunistyčnaja i kali z joj choć krychu źwiažeciesia, dyk moža jana Was uwiaści ŭ taki nierat, što budzie ni ŭzad ni ŭpierad.

M. Marozu ŭ Żodziškach. Cantrala Instytutu knižak Wam wyšle na papaŭnieńnie Wašaj biblijateki, tolki nia wiedaje, jak pasłać — ci pry akazii. Dobra byłob pry akazii, bo tady nia było-b raschodaŭ na pierasyłku. Kali chto budzie ad Was u Wilni, niachaj zojdzie na Zawalnuju 1 i tam atrymaje pryhatoŭlenuju pačku knih. Napišycie dla taho čaławieka paświedčańnie ad Wašaha hurtka, bo biez paświedčańnia knižki wydany nia buduć.

A. Ž u Šutawičach: staršynia Hurtka prosić prysłać abiacanaje („Z żałobnaje karty") i to nieadkładna. Prywitańnie dla „Śl. Mol." pieradana.

M. J. ŭ Świrydawičach: J. Š. prosić padać jamu dakładnyja wiedamaści ab utrakwistyčnaj škole ŭ Zalesi (jaje pačatki, chto wučyŭ, ci ciapier istnuje, bližejšyja danyja ab wučycielu Łazaru i inš). Treba dziela hetaha specyjalna padjechać u Zalesie. A Wy-ž možacie. Prywitańnie!

Sukničuskamu ŭ Sukniewičach. J. Š. Wašuju prywatnuju prośbu wykanaje. Pryšlicie tolki 4 zł., bo stolki budzie kaštawać prošanaje.

Staršyni Hurtka B.I.H.iK. u Daniušawie: Centrala B.I.H.iK. — čakaje aficyjalnych danych. Ci adbyŭsia ŭžo schod siabroŭ Hurtka? Kali nie, to parupciesia ab im! Zapisacca na Kooperatyŭny zawočny Kurs jašče možna.

Piatrusi Š. u Špiahlicy: ab padziejach u w. Pastaryniach II treba raźwiedać i prysłać dadzienyja nieadkładna.

Premija "Bieł. Krynicy".

Termin na atrymańnie druhoj premii: 1) Новая Зямля i 2) Сымон музыка — *Якуба Коласа*. 3) Z Rodnaha zahonu — *Andreja Ziaziuli*. 4) Kaniok Harbuniok — *W. A.* 5) Ziemlarobskaja čytanka. — *inž. Ad. Klimoviča*

pradaŭžajecca da 15 sakawika s. h. HRAMADZIANIE! Dyk wypiswajcie „Bieł. Krynicu" prysyłajučy pa adrasu: *Red. „Bieł. Krynica" Wilno, ul. Zawalna 1—1.* hadawuju padpisku 4 zł. i 50 hr. na pierasyłku premii.

Redaktar: Jan Paźniak

Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 3.

Wydawiec: A Šutow